радзімы, быць памяркоўным, міралюбівым, талерантным да людзей з адрозным мысленнем, светаўспрыманнем, стрыманым, трывалым і вынослівым, працавітым, заўважаць свае недахопы, шчыра выказваць свае эмоцыі, мець вялікую павагу да памерлых і да тых, хто будзе пасля нас.

## ЛІТАРАТУРА

1. Бажок, І. Філасофскае асэнсаванне рэчаіснасці ў эсэістыцы Людмілы Рублеўскай / І. Бажок // Роднае слова – 2018 – № 1. – С. 28–31.

2. Жаўняровіч, П. П. Публіцыстычны дыскурс Уладзіміра Караткевіча / П. П. Жаўняровіч; навук. рэд. В. І. Іўчанкаў. – Мінск: РІВШ, 2011. – 244 с.

3. Караткевіч, У. Збор твораў. У 25 т. / Уладзімір Караткевіч – рэд. тома Віктар Іўчанкаў – Мінск : Мастацкая літаратура, 2016. – Т. 12 : Публіцыстыка. Эсэ-нарысы. – 781 с.

4. Рублеўская, Л. І. Шыпшына для Пані : вершы і эсэ / Людміла Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 2007. – 254 с.

5. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / АН БССР, Ін-т мовазн. імя Я. Коласа ; пад агульн. рэд. К. К. Атраховіча. – Мінск: БелСЭ, 1977 – 1984. – 5 т.

УДК 821.161.3-311.6

Навуч. В.М. Азелава

Навук. кір. Н. С. Чухольская, настаўніца беларускай мовы і літаратуры

(ДУА «Сярэдняя школа №12 г. Слуцка»)

# “З ПРЫРОДАЙ ЗЛІЎШЫСЯ ДУШОЙ…” (ПЕЙЗАЖ НАСТРОЮ Ў ПАЭЗІІ І ЖЫВАПІСЕ НА ПРЫКЛАДАХ ТВОРАЎ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА І ВІТОЛЬДА БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў АДЛЮСТРАВАННІ ПОРАЎ ГОДА)

На цяперашнім этапе развіцця грамадства становяцца актуальнымі праблемы сапраўднага мастацтва і духоўнасці. Універсальнымі сродкамі для павышэння свайго духоўнага ўзроўню былі і будуць жывапіс і літаратура. Вывучаючы, найперш, паэзію слова, бачым сродкі, якімі карыстаецца пісьменнік або паэт. Гэта метафары, эпітэты, увасабленне, параўнанні. Мастак жа перадае на палатне бачанне свету праз колеры, адценні, святло. Кожны з іх уздзейнічае на чалавека па-рознаму, але дасягае мэты аднолькавай –

узрушыць наш духоўны свет. Як гэта адбываецца пакажа даследаванне.

**Тэма работы:** Пейзаж настрою ў паэзіі і жывапісе на прыкладах твораў Максіма Багдановіча і Вітольда Бялыніцкага-Бірулі ў адлюстраванні пораў года.

**Аб'ект даследавання:** пейзажу паэзіі М. Багдановіча і жывапісе В. Бялыніцкага-Бірулі.

**Прадмет даследавання:** вершы Максіма Багдановіча і жывапіс В. Бялыніцкага-Бірулі.

**Мэта работы:** выяўленне адметнасцейпейзажу настрою на прыкладах твораў М. Багдановіча і Вітольда Бялыніцкага-Бірулі ў адлюстраванні пораў года.

**Задачы:**

- раскрыць змест паняцця *пейзаж настрою*;
- устанавіць падабенства біяграфічных звестак паміж асобамі;
- выявіць адметнасці пейзажу настрою ў творах М. Багдановіча і В. Бялыніцкага-Бірулі.

**Гіпотэза:** М.Багдановіч,як і В. Бялыніцкі-Біруля, карыстаўся ў сваёй творчасці метадам “пейзаж настрою”.

Навізна даследчай работы заключаецца ў тым, што літаратурныя крыніцы не даюць звестак пра выкарыстанне Максімам Багдановічам у сваёй творчасці метаду “пейзаж настрою”.

Практычнае прымянне дадзенай работы вызначаецца магчымасцю выкарыстоўваць матэрыял даследавання на ўроках літаратуры, айчыннай і сусветнай мастацкай культуры і ў пазакласнай рабоце.

**Метады даследавання:** пошукавы; параўнальны аналіз; сінтэз; абагульненне.

У ходзе даследавання выявілася, што накірунак, у якім працавалі абодва, – пейзаж настрою. Як апісальнік прыроды М. Багдановіч не дае нам шырокіх пейзажаў; ён замалёўвае толькі асобныя штрыхі і галоўным чынам іх суб'ектыўнае праламленне ва ўласнай душы. Такім чынам,уся дзейнасць у вачах паэта раскладваецца на шэраг асобных момантаў, імгненняў, якія ён, як сапраўдны пейзажыст, і перадае ў сваіх мініяцюрах.

Што да Бялыніцкага-Бірулі, то тут надаецца выключная ўвага дэталям, найтанчэйшым нюансам, паўценям, паўтонам у характары, з'яве; гэта сапраўднырейзаж настроюўперадачы колеру, каларыту, стану.

Абодва мастакі паказваюць знітаванасць чалавека з прыродай. Як і характар чалавека, яна (прырода) бывае рознай, зменлівай, і кожны з творцаў бачыць яе па-рознаму. Так, Бялыніцкі-Біруля і М.Багдановіч праз сваю творчасць імкнуліся перадаць узаемасувязь прыроды і чалавечых пачуццяў, нават перадаць тую атмасферу і час, у які яны жылі.

Бацькаўшчына ніколі не забывае тых, хто свой талент і нават жыццё кладзе на яе алтар. Так, у Мінску створаны літаратурны музей М. Багдановіча, у Магілёве – мастацкі музей В. Бялыніцкага-Бірулі, вуліцы названы ў гонар паэта і мастака.

Матэрыял даследавання можна выкарыстоўваць на ўроках беларускай мовы і літаратуры, сусветнай і айчыннай культуры, на факультатыўных занятках, пры правядзенні прадметных тыдняў, пры арганізацыі экскурсій і паездак, у працэсе самастойнага вывучэння класікаў беларускай літаратуры і жывапісу.
Прадуктам даследавання з'яўляецца відэаролік "Пейзаж настрою ў паэзіі Максіма Багдановіча і жывапісе Вітольда Бялыніцкага-Бірулі".

УДК 398.1(476.2)

Вуч. Г.А. Астрэйка
Навук. кір. Сямёнава А.У., настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА «Сярэдняя школа № 7 г. Баранавічы»)

## МАГІЯ СЛОВА ЧАРОЎНАГА (ЗАМОВЫ Ў ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЖЫХАРОЎ БАРАНАВІЦКАГА КРАЮ)

**Уводзіны.** На календары вечнасці – 21 стагоддзе, эпоха навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, эпоха біёнікі і электронікі… Узброены ведамі чалавек ужо абганяе сёння самую смелую фантазію, самыя няўрымслівыя мары. Мы ж імкнемся да адкрыцця новага. І таму жывая цікавасць, якую выклікаюць беларускія замовы, невыпадковая. Яшчэ задоўга да таго, калі мастацкае слова было зафіксавана ў помніках пісьменнасці, народ выяўляў свае настроі і думы ў песнях, замовах, легендах і паданнях, якія былі першымі праявамі яго мастацкай творчасці. Даволі значны час мы ігнаравалі замовы як фальклорны жанр, пазбаўлялі сябе магчымасці задумацца над глыбокімі асновамі слова, якое здаўна надзелена магічным значэннем.У арсенале народнай педагогікі слова як стымул, як сродак уплыву на псіхічны стан чалавека займала важнае месца. Сёння мы, як